визуального воздействия на обучающихся в процессе просмотра. Вышесказанное дает основание определить аутентичные видеоматериалы как эффективное средство обучения иностранному языку.

УДК 37.018

# ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ КРЭДЫТНАЙ СІСТЭМЫ Ў АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

# FUTURE DEVELOPMENT OF CREDIT SYSTEM IN EDUCATION OF BELARUS

**Наумчык В.М.**
**Naumchyk V.**
Рэспубліканскі інстытут прафесіянальнай адукацыі
Мінск, Беларусь

*Разглядаюцца прынцыповыя бакі крэдытнай сістэмы адукацыі. Звяртаецца ўвага на эканамічную сутнасць новаўвядзення. Падкрэслены пазітыўныя і негатыўныя якасці крэдытнай сістэмы ў Беларусі.*

*The fundamental aspects of the credit system in education are touched upon. Attention is paid to the economic essence of the innovation. The positive and negative aspects of the credit system in Belarus are highlighted.*

Беларусь далучылася да Балонскага працэсу. Адным з галоўных інструментаў Балонскай дэкларацыі лічыцца так званая сістэма крэдытных адзінак, якая існуе ў многіх заходніх універсітэтах. Паколькі крэдытная сістэма ў адукацыі не мае ніякага дачынення да фінансаў, то дамовіліся выкарыстоўваць замест тэрміна «крэдытная адзінка» выраз «заліковая адзінка», каб не блытаць яе з эканамічным паняццем. Каб зразумець сутнасць праблемы, звернем увагу на тое, што ў нашай сістэме заліку ў дадатку да дыплома выпускніка паказаны прадмет (філасофія, культуралогія, матэматыка) і колькасць гадзін, прадугледжаных вучэбным планам на гэту дысцыпліну. Калі выпускнік прыязджае ў якую-небудзь краіну Еўропы ці Амерыкі і паказвае свой дадатак да дыплома, гэта вызывае непаразуменне: Захад не прывык да такой формы кваліфікацыі ўзроўню ведаў спецыяліста, ім патрэбны веды, а не гадзіны. Іх цікавяць не толькі гадзіны, азначаныя ў дадатку да дыплома, але ж ўсе гадзіны, якія патрэбны для засваення курса.

Заўважу, што не існуе адзінага падыходу да структуры заліковых адзінак нават у заходнім свеце. Так, у амерыканскай сістэме есць сістэма крэдытных адзінак, у якой студэнт за адзін год павінен атрымаць 30 крэдытаў. У Вялікабрытаніі студэнт павінен атрымаць ужо 120 крэдытаў, а ў краінах Еўрапейскага Саюза ўведзена сістэма ECTS (European Credit Transfer System), г. зн. Еўрапейская сістэма заліковага пераводу, тут неабходна 60 адзінак. Відавочна, што нават тыя, хто пагадзіўся прыняць гэту сістэму, не заўсёды здольны параўнаць крэдыты адзін аднаго. Такім чынам, амерыканскі крэдыт адрозніваецца ад еўрапейскага. У еўрапейскай тэрміналогіі заліковыя адзінкі ECTS уключаюць усе працазатраты: і самастойную работу студэнта, і здачу экзаменаў і залікаў, і кантактную працу з выкладчыкам. У Амерыцы крэдытная сістэма грунтуецца перш за ўсё на часе кантакту студэнта з выкладчыкам.

Каб атрымаць крэдыт, трэба перш за ўсё праслухаць курс, а вынік экзамену слаба ўплывае на атрыманне крэдыта.

ECTS пачалі распрацоўваць у 1988 годзе і потым на працягу 6 гадоў апрабіравалі ў 145 еўрапейскіх вну. Гэтыя вну не былі поўнасцю пераведзены на ECTS, крэдыты дзейнічалі толькі ў пяці адукацыйных напрамках – MBA (Master of Business Administration), хімія, гісторыя, тэхнічная механіка і медыцына. Да 1995 г. сістэма атрымала права на далейшае распаўсюджанне: да яе далучыліся яшчэ 74 вну (больш за 550 факультэтаў). У 1999 – 2000 годзе гэтай сістэмай карысталіся больш за 1200 універсітэтаў у Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Іспаніі, Італіі. Іх вопыт падказвае, што лепш за ўсе ECTS зарэкамендавала сябе ў філалогіі, бізнесу, сацыяльных, інжынерных і юрыдычных навуках.

Сутнасць крэдытнай сістэмы ECTS у тым, што гэта своеасаблівы рэйтынг дысцыплін. Крэдыты – гэта адзінкі, у якіх вымяраецца вучэбная нагрузка студэнта. Колькасць крэдытаў, прысвоеных прадмету, адпавядае яго значнасці. Напрыклад, педагогіка ацэньваецца ў чатыры крэдыты, а культуралогія – у тры. Гэта значыць, што педагогіка ў данай спецыяльнасці важней, і ў праграме яе было больш, чым культуралогіі.

ECTS эфектыўна, калі ў яе ўключана шмат устаноў вышэйшай адукацыі (УВА), пажадана, уся адукацыйная сістэма. Калі б ECTS працавала б толькі ў адным універсітэце, ад яе было б мала плёну. Чым больш вну яна ахоплівае, тым больш напаўняецца сэнсам. Назначэнне сістэмы – ў стварэнні так званай акадэмічнай мабільнасці. Іншымі словамі, крэдыты дазваляюць студэнту вучыцца ў зусім розных месцах: ECTS пераўтварае ўсе УВА ў адзін вялікі ўніверсітэт. У ідэале справа такая. Студэнту, які вывучыў гісторыю ў родным вну, трэба прайсці культуралогію. Але ж ён ведае дакладна, што ва ўніверсітэце, які знаходзіцца ля суседней станцыі метро (ці ў іншай краіне), культуралогію выкладае выдатны прафесар. Такога прафесара не знайсці ў родных сценах, і студэнт адпраўляецца да яго за гэтым курсам. Ен слухае лекцыі і здае экзамен, пасля чаго атрымлівае ў гэтай УВА адпаведныя крэдыты. Прыкладна так і выглядае акадэмічная мабільнасць згодна нарматывам, выпрацаваным ЮНЕСКО. Прычым, для УВА знікае сэнс запрашаць да сябе выдатных выкладчыкаў. Студэнты самі адпраўляюцца да іх.

З пункту гледжання назапашвання ведаў і вопыту працы крэдытная сістэма азначае адукацыю на працягу ўсяго жыцця. У гэтым выпадку гавораць пра адукацыйную траекторыю, якую чалавек сам сабе будуе, паступаючы ў тую ці іншую навучальную ўстанову і набываючы адпаведныя прафесіі. Заліковыя адзінкі патрэбныя для спрошчанай прафесійнай трансфармацыі. Напрыклад, чалавек скончыў тэхнічную УВА, а затым дадатковыя курсы, і ён становіцца эканамістам, таму што яму залічваюцца ўсе ўніверсітэцкія курсы, неабходныя для яго новай спецыяльнасці.

Заўважым, што ECTS нагадвае вядомую піраміду: выігрывае той, хто кантралюе рух яе рэсурсаў. У дадзеным выпадку мы маем справу з асобым рэсурсам – інтэлектуальным. Сістэма крэдытных адзінак, нягледзячы на яе знешнюю прывабнасць і ўніверсальнасць, у значнай ступені здольна выклікаць перабудову вучэбных планаў УВА. Кіраўнікі шэрагу лідыруючых УВА не змогуць залічыць тыя ці іншыя прадметы студэнтам, нягледзячы на тое, што яны ў іншай УВА праслухалі той жа курс і ў тым самым аб’ёме, што і ў данай УВА. Крэдытная сістэма пераўтварае падрыхтоўку спецыяліста ў нейкую мазаічную адукацыйную структуру. У існуючай сістэме адукацыі (назавем яе сістэмай паслядоўнай адукацыі) вучэбным планам прадугледжана строгая паслядоўнасць засваення курсаў, пры крэдытнай сістэме – студэнт сам выбірае, якія і калі праходзіць дысцыпліны. Каб упэўніцца ў сур’езнасці данай праблемы, дастаткова ўявіць сабе, як бы мы ставіліся да кваліфікацыі ўрача,

які абраў сабе індывідуальную траекторыю падрыхтоўкі. Наша традыцыйная сістэма паслядоўнай адукацыі, калі студэнт праходзіць на пэўных этапах пэўныя курсы і завяршае курс экзаменам ці залікам, дастаткова эфектыўная.

І яшчэ адзін аспект, звязаны з мабільнасцю інтэлектуальнага рэсурса краіны. Калі ўлічыць узровень зарабатнай платы ў нашай краіне і па-за яе межамі, то такая мабільнасць прывядзе да таго, што мы будзем рыхтаваць спецыялістаў для Заходняй Еўропы, прычым, бясплатна. Таму праблему Балонскага працэсу трэба абавязкова вырашаць у комплексе з сацыяльнымі праблемамі краіны.

Падводзячы вынік, трэба вызначыць пазітыўныя і адмоўныя якасці крэдытнай сістэмы ў адукацыі.

*Пазітыўныя якасці:*

– студэнт атрымлівае большую ступень свабоды, ён разумее сваю адказнасць за сваю асабістую адукацыю;
– студэнт вызначае і ўключаецца ў сваю асабістую адукацыйную траекторыю;
– атрымліваецца эканомія жыццёвых сіл і ў значнай меры аптымізацыя адукацыі;
– мабільнасць прадугледжвае ўключэнне індывіда ў сістэму полікультурнага засваення свету.

*Негатыўныя якасці ECTS:*

– ECTS нагадвае «піраміду»: выігрывае той, хто кантралюе рух яе рэсурсаў;
– дадатковыя ступені свабоды – прывабная перспектыва для маладога чалавека, на самой справе здольная аказацца інструментам маніпуляцыі ў руках арганізатараў «піраміды»;
– вну здымаюць з сябе адказнасць за якасць падрыхтоўкі спецыяліста, які перайшоў на асабістую адукацыйную траекторыю;
– адбываецца адцягненне студэнта ад сваёй УВА, ён аказваецца ў нейкай адукацыйнай прасторы. Адбываецца адтаржэнне спецыяліста і ад свайго дома, ад сваёй краіны. Ён, як нейкі інтэлектуальны рэсурс, уключаецца ў чужую вытворчасць, прычым гэта робіцца задарма для заходніх фірм;
– няма неабходнасці ўдасканальваць сістэму адукацыі ў тым ці іншым УВА, што абавязкова прывядзе да паніжэння якасці айчыннай адукацыі;
– карысць для фірм – арганізатараў піраміды – відавочна: для іх няма неабходнасці займацца ўдасканаленнем сваіх УВА ў цэлым. Дастаткова, калі ў УВА будзе адзін-два вядомых вучоных. Гэта нават выгадна эканамічна: запрошаны студэнт (патэнцыяльны спецыяліст фірмы) каштуе даволі танна, таму няма неабходнасці несці траты на УВА. Больш таго, не трэба трацішча на ўдасканаленне пачатковай і сярэдняй адукацыі, якія з’яўляюцца залогам паспяховай падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй. Буйным канцэрнам неабходны высокакласныя спецыялісты. Яны ім неабходны, каб выжыць, каб абыйсці канкурэнтаў, неабходны, каб дамінiраваць у свеце;
– краінам, якія ўваходзяць у Балонскае пагадненне, рэкамендуецца значна павялічыць падрыхтоўку студэнтаў з ступенню бакалаўра. Бакалаўрыят – гэта найнізшая ступень спецыяліста, за якую трэба меньш за ўсё плаціць. У той жа час краіна, якая перайшла на падрыхтоўку бакалаўраў, замест спецыялістаў ці магістраў, становіцца своеасаблівым дадаткам інтэлектуальнай «сыравіны» капіталістычных фірм. Прычым, гэта адбываецца дабравольна, «без прымусу».

Улічваючы станоўчыя вынікі крэдытнай сістэмы, можна рэкамендаваць выкарыстоўваць некаторыя яе элементы ў Беларусі. Для гэтага перш за ўсё трэба стварыць сваю нацыянальную сістэму заліковых адзінак, якая бы абапіралася на адпаведную нарматыўную базу і працавала бы ў межах саюзных краін. Важна вызначыць таксама вядучыя навучальныя ўстановы па розных напрамках і абапірацца на навуковыя школы, якія маюцца амаль пры кожнай УВА.

УДК 35.074;378.1

# СИСТЕМА НАУЧНО-МЕТОДИЧЕСКОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

# SYSTEM OF SCIENTIFIC AND METHODOLOGICAL SUPPORT OF EDUCATION

**Селивончик Н.М., Тамело В.Ф.**
**Selivonchik N., Tamelo V.**
Белорусский национальный технический университет
Минск, Беларусь

*В статье изложена структура научно-методического обеспечения подготовки военных специалистов. Рассмотрены научное и методическое обеспечение образовательного процесса. Изложена система управления качеством научно-методического обеспечения.*

*The structure of scientific and methodological maintenance of training of military experts is provided. The scientific and methodical maintenance of educational process is reviewed. The quality control system of the scientific and methodical maintenance is outlined.*

Система научно-методического обеспечения – совокупность взаимодействующих компонентов, направленных на достижение целей планирования, ведения и контроля образовательного процесса на основе результатов научных исследований в сфере образования.

Обосновывая понятие системы научно-методического обеспечения образовательного процесса, следует отметить единый подход в дефинициях систем различного назначения. Система – это комплекс взаимосвязанных элементов, функционирующих в едином целевом назначении в плановом, организационном порядке. Рассматривая систему научно-методического обеспечения образовательного процесса (рис. 1), следует отметить, что структурными элементами могут быть: кадровый состав управленцев, профессорско-преподавательского и учебно-вспомогательного состава, методистов, а также обучающихся; сами учреждения высшего образования со всей инфраструктурой и материально-технической базой; научно-методический потенциал на основе нормативно-правовой базы государства, министерств и ведомств, учреждений и организаций, принимающих участие в образовательном процессе подготовки специалистов; технические средства обучения и информационный (в т.ч. инновационный) ресурс. Используя военную терминологию, для управления процессом необходимы: органы управления, пункты управления и средства управления.